МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

# ФОРМИРОВАНИЕ ПРОФЕССИОНАЛИЗМА УЧИТЕЛЯ: ПРОБЛЕМЫ, ПОИСКИ РЕШЕНИЙ НА РУБЕЖЕ СТОЛЕТИЙ

**Материалы Международной научно-практической конференции**

**3 – 5 мая 2000 г.**
**г. Барановичи, Беларусь**

**В 2 частях**
**Часть 1**

**Барановичи**
**2000**

УДК 371.13 (043.2)
ББК 74 р
Ф 79

**Рецензенты:** кафедра педагогики Академии последипломного образования, доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки РБ А.П. Сманцер

**Редакционная коллегия:** Мирзаянова Л.Ф. (главный редактор), Дудко В.А., Малиновский Е.Л. (отв. редактор 2 части сборника), Маслов Ю.В. (отв. редактор 2 части сборника), Сотник Н.М., Шавель О.М.

Ф 79 **Формирование профессионализма учителя: проблемы, поиски решений на рубеже столетий:** Материалы междунар. науч.-практ. конф. В 2 ч. Ч. 1 / Ред. кол.: Л.Ф. Мирзаянова (гл. ред.). -- Барановичи: БГВПК, 2000. – 287 с.

ISBN 985-6616-02-6
ISBN 985-6616-03-4 (ч. 1)

В сборнике помещены статьи участников Международной научно-практической конференции "Формирование профессионализма учителя: проблемы, поиски решений на рубеже столетий". В статьях отражено современное состояние проблемы, дано методологическое и практическое обоснование путей и средств ее решения на современном этапе реформирования педагогического образования в РБ, представлен методический опыт работы преподавателей в данном направлении.

Материалы сборника предназначены научным коллективам, учителям школ, преподавателям средних и высших педагогических учебных заведений.

ISBN 985-6616-02-6
ISBN 985-6616-03-4 (ч. 1)

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

УДК 371. 13 (043.2)
ББК 74 р
Ф 79

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2000

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

Криворожского экономического института)……………………….
**В.М. Шявель.** Аб удасканаленні падрыхтоўкі настаўнікаў да выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах…………………..
**Л.У. Урбановіч.** Педагогіка мастацкага ўспрымання твораў У. Караткевіча (з вопыту работы ў педагагічным каледжы)………..…
**Л.А. Климашевская.** Учебно-методический комплекс как один из способов организации самостоятельной работы на занятиях по прикладной информатике……………………………………………
**Л.А. Иваненко.** Использование автоматических обучающих систем при организации самостоятельной работы студентов………………

5. **ИССЛЕДОВАНИЕ ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ПРОФЕССИОНАЛИЗМА УЧИТЕЛЯ………………………..**

**В.А. Янчук.** Интегративно-эклектический подход к анализу психологической феноменологии………………………………………
**Л.Ф. Мирзаянова.** Механизмы упреждающей адаптации к педагогической профессии………………………………………………….
**Е.В. Ширшова.** Разработка творческих проектов как форма научно-исследовательской работы студентов……………………………..
**М.И. Ковалева, Т.С. Юшина.** Методика формирования понятия "стиль" у учащихся педучилища в процессе изучения музыкальной литературы……………………………………………………………..
**С. Николаева.** Об отношении учеников к школьной жизни……….
**И.А. Горская.** Формирование механизма слухового контроля как необходимого компонента профессионально-педагогической подготовки учителя иностранного языка………………………………
**Т.С. Рашевская.** К вопросу об удовлетворенности педагогической профессией студентов высшего педагогического колледжа………..
**З.М. Ходасевич.** Подготовка учителя к диагностике преемственности познавательных интересов школьников…………………………..
**Н.М. Хлопицкая.** Влияние учителя как языковой личности на речевое развитие детей……………………………………………..
**М.І. Сянкевіч.** Фарміраванне літаратурных здольнасцей вучняў….
**Е.В. Дроботова, О.В. Стрижак.** Операционные возможности педагога как образ внутренних условий формирования и развития профессионализма……………………………………………………….
**Е.А. Бай.** К вопросу о совершенствовании подготовки специалистов для системы дошкольного образования………………

«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

# АБ УДАСКАНАЛЕННІ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ ДА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

В.М. Шавель

Беларусь, г. Баранавічы

Практыка паказвае, што большай увагі ў працэсе выкладання методыкі беларускай мовы ў пачатковых класах патрабуюць пытанні, якія адносяцца да вучэбна-выхаваўчай работы ў школе, дзе гэтая мова вывучаецца як другая, наступная ў працэсе навучання за рускай.

Наяўнасць значнай колькасці агульнага ў абедзвюх мовах стварае бачнасць лёгкасці вывучэння беларускай мовы. Аднак гэта не так. Побач з агульнымі рысамі, беларуская і руская мовы маюць адметныя асаблівасці, абумоўленыя ўнутранымі законамі іх развіцця. Спецыфіка навучання беларускай мове як другой заключаецца ў суаднесенасці з рускай мовай: з аднаго боку, ва ўліку транспазіцыі (станоўчага пераносу) ведаў, уменняў і навыкаў з рускай мовы ў беларускую; з другога, -- ва ўліку міжмоўнай інтэрферэнцыі (адмоўнага пераносу).

Пераадоленне інтэрферэнцыі магчыма не толькі шляхам сістэматычных адкрытых міжмоўных супастаўленняў, але і з дапамогай спецыяльнага планавання навучання на ўроку, накіраванага на папярэджанне інтэрферэнцыі, на карэкцыю ўменняў і навыкаў, атрыманых на ўроках рускай мовы, у адпаведнасці з заканамернасцямі беларускай мовы, якія засвойваюцца.

Уменні і навыкі інтэрферыраваць карэкціруюцца і адпрацоўваюцца ў працэсе выканання спецыяльна прадуманых практыкаванняў. Поспех гэтай работы будзе тым большы, чым больш увагі настаўнік удзеліць усведамленню фарміруемых дзеянняў у лінгвасупастаўляльным плане (правядзенне міжмоўнай аналогіі, устанаўленне адрозненняў у фактах абедзвюх моў). Выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў патрабуе прымянення разнастайных прыёмаў ( міжмоўнае параўнанне, аналогія, абагульненне) і сродкаў (дыялогаў, моўных сітуацый), якія ў сукупнасці садзейнічалі б развіццю ў школьнікаў свядомага пераходу з адной мовы ў другую. У сувязі з гэтым задачы навучання беларускай мове ва ўмовах двухмоўя заключаюцца не толькі ў набыцці новых ведаў, уменняў і навыкаў, але і ў актуалізацыі і карэкцыі (унясенні папраўкі) ведаў, уменняў і навыкаў.

Выкладчыку варта мець на ўвазе і тое, што вучыць дзяцей валодаць беларускай мовай – гэта значыць вучыць іх думаць на гэтай мове. Таму трэба знаёміць студэнтаў з прыёмамі, якія стымулююць унутраную мову вучняў. Таксама варта акцэнтаваць ўвагу на ўроках методыкі на механізмах дзеяння ўсвядомлена-практычнага прынцыпу (ад асаблівасцей моўных адзінак да выпрацоўкі навыкаў у працэсе практыкі маўлення) як аднаго з асноўных прынцыпаў навучання беларускай мове ў рускамоўных школах, які распаўсюджваецца на ўсе ўзроўні моўнай дзейнасці. Аналізаваць эфектыўнасць выкарыстання другіх спецыфічных прынцыпаў (не супадаюць з агульнадыдактычнымі), якія вызначаюцца заканамернасцямі самой мовы і асаблівасцямі авалодання маўленнем: апераджальнае развіццё вуснай мовы; узаемасувязь усіх бакоў мовы ў працэсе навучання (у адпаведнасці з гэтым – комплексны падыход да вывучэння слова).

Арганізацыя аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці школьнікаў пры авалоданні маўленнем ажыццяўляецца з дапамогай сістэмы метадаў, апісаных у спецыяльнай літаратуры па пытаннях навучання мове ў нацыянальнай школе. Да ліку іх М.Б. Успенскі адносіць: рэцэптыўна-імітацыйны (слуханне і вуснае ўзнаўленне гука, склада, слова), аперацыйны (аналітычныя і сінтэтычныя практыкаванні на ўзроўні слова і сказа), прадуцыравання мовы. Веданне гэтых метадаў і

способаў іх рэалізацыі асабліва неабходна настаўніку пачатковых класаў, які навучае дзяцей беларускай мове ў рускамоўнай школе, бо як яго дзейнасць звязана з фарміраваннем у вучняў першасных навыкаў гаворыць па-беларуску.

Такім чынам, у змест методыкі навучання беларускай мове ў пачатковых класах ва ўмовах двухмоўя павінна ўваходзіць абгрунтаванне і вызначэнне способаў навучання з улікам транспазіцыі і інтэрферэнцыі ведаў, уменняў і навыкаў; карэкцыя дзеючай у методыцы выкладання беларускай мовы (як першай) способаў падачы вывучаемага матэрыялу, метадаў і прыёмаў яго замацавання на аснове прынцыпу суаднесенасці.

Літаратура

1. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах. – Мн., 1986. – 408 с.
2. Праграма "Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах". – Мн.: 1994. – 51 с.

## ПЕДАГОГІКА МАСТАЦКАГА ЎСПРЫМАННЯ ТВОРАЎ У. КАРАТКЕВІЧА
### (з вопыту работы ў педагагічным каледжы)

П.У. Урбановіч

-- ведаць асаблівасці творчасці У. Караткевіча як заснавальніка гістарычнай тэмы ў беларускай літаратуры;

-- раскрываць аўтарскую пазіцыю;

-- усведамляць сэнс гістарычных падзей на Беларусі, якія знайшлі адлюстраванне ў прозе У. Караткевіча;

-- рабіць гістарычны каментарый да раздзелаў твора, эпізодаў;

-- асэнсоўваць ролю сімвалаў у рамане "Каласы пад сярпом тваім";

-- раскрываць моўнае багацце твораў пісьменніка;

-- умець вызначыць сувязь мінулага з сучасным у творы і ў жыцці;

-- бачыць дыялектыку развіцця асобы (героя);

-- раскрываць нацыянальныя рысы беларусаў, народную псіхалогію і філасофію;

-- разумець ролю гістарычнай асобы ў жыцці народа і спадчыны як духоўнага набытку папярэдніх пакаленняў;

-- асэнсоўваць вялікую выхаваўчую магчымасць гістарычнай прозы У. Караткевіча ў адраджэнні гістарычнай памяці народа.

У. Караткевіч імкнецца адрадзіць чалавека, вярнуць яму веру ў сябе, у жыццё і свет. Творы пісьменніка праз гісторыю, гістарычную асобу заклікаюць удасканальваць жыццё. У. Караткевіч паказвае гісторыю быцця народа ва ўсёй паўнаце яго сацыяльных і маральных супярэчнасцей, у вобразе асобы ён намагаецца знайсці і сцвердзіць этапы маральна-духоўнага развіцця беларускага народа. І менавіта гэтым творы У. Караткевіча маюць вялікую каштоўнасць у выхаванні асобы чалавека, яго светапогляду, маралі, жыццёвай пазіцыі.

Адбіраючы творы У. Караткевіча для засваення вучэбнай аўдыторыяй, мэтазгодна ўлічваць такі фактар, як абмежаванасць праграмы па ўключэнні твораў гэтага аўтара.

Крытэрыямі адбору твораў, на наш погляд, могуць служыць:

-- высокія мастацкія і ідэйныя вартасці твора;

-- наяўнасць станоўчай маральнай асновы, на якой будуецца твор;

-- паўната філасофскага абгрунтавання гістарычных фактаў, падзей, увядзенне пэўных гістарычных асоб;

-- раскрыццё дыялектыкі жыцця беларускага народа, уключаючы такія яго праявы, як нацыянальны характар і нацыянальная псіхалогія;

-- мера цікавасці навучэнцаў да твора;

-- даступнасць твора, займальнасць сюжэта;